УДК 37.064.1: 371.388.6

# САТВОРЧАСЦЬ НАСТАЎНІКАЎ І БАЦЬКОЎ У ПРАЦЭСЕ АРГАНІЗАЦЫІ ДАСЛЕДНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Кажура Віктар Віктаравіч,***
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі "Вілейская гімназія №2"*
*E-mail: lyoli@inbox.ru*

# *CO-CREATION OF TEACHERS AND PARENTS IN THE PROCESS OF ORGANIZING STUDENTS' RESEARCH ACTIVITIES*

***Kozhura Viktor Viktorovich,***
*teacher of the belarusian language and literature of the State Educational Institution "Vileisk gymnasium № 2"*

**Анатацыя.** У артыкуле прадстаўлены вопыт работы па арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў. Аўтар раскрывае новыя формы супрацоўніцтва настаўнікаў і  бацькоў у процэсе арганізацыі даследніцкай дзейнасці вучняў.

**Annotation.** The article presents the experience of organizing students' research activities. The author reveals new forms of cooperation between teachers and parents in the process of organizing students' research activities.

**Ключавыя словы:** настаўні, вучні , бацькі, даследніцкая дзейнасць, сатворчасць.

**Keywords:** mentors, students, parents, research activity, co-creation.

Адукаванасць чалавека вызначаецца не столькі спецыяльнымі (прадметнымі) ведамі, колькі яго рознабаковым развіццём як асобы. Сучасная моладзь павінна добра арыентавацца ў традыцыях айчыннай і сусветнай культуры, сістэме каштоўнасцей, асобы, быць здольнай да актыўнай сацыяльнай адаптацыі ў грамадстве і самастойнага жыццёвага выбару, самаадукацыі і самаўдасканалення. Гэта абумоўлівае скіраванасць адукацыйнага працэсу на шматпланавае развіццё дзіцяці, раскрыццё яго творчых магчымасцей, здольнасцей, такіх якасцей асобы, як ініцыятыўнасць, самастойнасць, фантазія, самабытнасць. Навучанне павінна фарміраваць пазнавальныя інтарэсы, развіваць здольнасці, заахвочваць да творчай дзейнасці.

Важнейшай адукацыйнай стратэгіяй, скіраванай на падрыхтоўку актыўных выпускнікоў школ, з’яўляецца ”ўзмацненне даследніцкага аспекту дзейнасці вучняў” [2, с. 14]. Умела арганізаваная даследніцкая дзейнасць для вучняў – гэта развіццё творчых і даследніцкіх здольнасцей, навыкаў самастойнай работы, работы ў групах і ў камандзе, трэніроўка навыкаў адстойваць свой пункт гледжання.

Настаўнікам даследніцкая дзейнасць дапамагае павысіць адказнасць вучняў за свае ўчынкі, раскрыць творчыя, арганізатарскія, лідарскія здольнасці дзіцяці.

Для бацькоў – гэта арганізацыя вольнага часу дзіцяці, паляпшэнне вынікаў яго вучобы, зніжэнне канфліктаў у сям'і, магчымасць актыўнага ўдзелу ў школьным жыцці [3].

Уласныя назіранні і вопыт працы з юнымі даследчыкамі дазваляюць дапоўніць агульнавядомыя спосабы выяўлення і суправаджэння здольных вучняў некалькімі прапановамі.

Па-першае, зыходзячы з таго, што даследніцкая дзейнасць забірае шмат часу (калі мы вызначаем самыя сур'ёзныя задачы), лічу неабходным абавязковыя папярэднія кансультацыі з настаўнікамі-псіхолагамі (анкетаванне па выяўленні зацікаўленасці вучняў да даследніцкай дзейнасці).

Па-другое, такія ж папярэднія кансультацыі абавязкова праводжу і з бацькамі, каб нашы планы не супярэчылі бацькоўкім.

Абапіраючыся на раней сказанае, прыйшоў да высновы, што плённай будзе толькі тая дзейнасць, якая грунтуецца на наступным трыадзінстве: зацікаўлены настаўнік, зацікаўлены вучань, зацікаўленыя бацькі. Калі выпадае хоць адзін з названых кампанентаў, то і работа не атрымаецца.

Мне пашанцавала: бацькі маіх вучняў з паразуменнем ставяцца да даследніцкай дзейнасці, заўсёды падтрымліваюць, аказваюць пасільную, а часам і неацэнную дапамогу. Памятую выпадак, калі шаснаццаць год таму мы рабілі першыя крокі ў арганізацыі даследніцкай дзейнасці па беларускай мове і літаратуры ў гімназіі, не абыходзілася без непаразуменняў. Адзін здольны, таленавіты і зацікаўлены вучань пажадаў займацца даследніцкай дзейнасцю. Аднак яго бацькі катэгарычна выказаліся: «Нам гэта не патрэбна, у нас іншыя планы». Мне здаецца, што тады настаўнікі страцілі таленавітага даследчыка.

На маю думку, бацькі гэтага вучня не да канца ўсвядомілі, што ад сфарміраванасці ў чалавека даследніцкай пазіцыі ў многім залежыць магчымасць яго адаптацыі ў зменлівых жыццёвых і прафесійных сітуацыях, прафесійная мабільнасць асобы. Даследніцкая дзейнасць садзейнічае пашырэнню дыяпазону ведаў, актывізацыі пазнавальнай цікавасці, развіццю ўменняў самастойна знаходзіць і аналізаваць інфармацыю, планаваць сваю дзейнасць, кантраляваць і ацэньваць свае дзеянні, фарміраваць уласныя меркаванні [1].

Калі ж паразуменне знаходзілася і калі захоўваліся ўсе патрабаванні сатворчасці, то і вынікі не прымушалі сябе чакаць. Так, вучаніца гімназіі Бажэна Мацюк падрыхтавала даследаванне «Вілейшчына літаратурная». Работа перададзена ў мясцовы краязнаўчы музей для выкарыстання падчас мерапрыемстваў, прысвечаных гісторыі роднага краю. Разам з гэтым была выказана прапанова: усталяваць на вуліцы Жалігоўскага, дзе жыла вучаніца, памятную дошку ў гонар вядомага паэта-дэмакрата, ураджэнца Вілейскага раёна Эдварда Савы (Жалігоўскага). Прапанову прынялі. А сродкі

на ўсталяванне (па ініцыятыве бацькоў Бажэны) былі сабраны жыхарамі вуліцы.

Прыкладам плённай сатворчасці вучняў, настаўнікаў і бацькоў у працэсе арганізацыі даследніцкай дзейнасці можна лічыць і ўдзел Кабак Валерыі ў XXI і XXII Юнацкіх чытаннях імя Вярнадскага ў Маскве, дзе вучаніца атрымала дыплом лаўрэата. Тут з самага лепшага боку выявілася зацікаўленасць бацькоў у паспяховым выступленні Валерыі, калі тата на сваім аўтамабілі дастаўляў нашу каманду ў Маскву, а пасля заканчэння Чытанняў забіраў назад у Вілейку, праехаўшы пры гэтым больш за 3200 км. Мама ж вучаніцы дапамагала кіраўніку каманды рыхтаваць выступленні дачкі, кансультавала і суправаджала падчас абароны работ.

І гэта не адзінкавыя выпадкі, калі бацькі, ахвяруючы сваім часам і сваімі планамі, на першае месца ставілі дапамогу дзецям. Як гэта было з Грабоўскай Аляксандрай, Бурак Яўгеніяй, Шалкоўскай Бажэнай, Паўлавай Арынай…

Сатворчасць настаўнікаў і бацькоў у працэсе арганізацыі даследніцкай дзейнасці дае багаты вопыт, неабходны вучням, які з цягам часу праяўляецца ў будучым. Так, Бажэна Мацюк, студэнтка першага курса філалагічнага факультэта, стала параможцай універсітэцкай канферэнцыі навукова-даследчых работ аспірантаў і студэнтаў БДУ.

Як кіраўніку даследніцкіх работ вучняў, мне прыемна тое, што мае ўнукі Ангеліна і Цімафей самі выказалі жаданне і ўжо далучыліся да такой дзейнасці. Яны даследуюць гісторыю Вілейскага раёна. У гэтым іх падтрымлівае сям’я: мама, бабуля, дзядуля.

**Спіс літаратуры**

1. Лестева, Е. В. Педагогическое сопровождение исследовательской деятельности учащихся в процессе преподавания гуманитарных дисциплин: автореф. дисс. … канд. пед наук: 13.00.01 / Е. В. Лестева. – Смоленск. – 2009. – 19 с.
2. Проказова, О. Г. Организация исследовательской деятельности учащихся: автореф. дисс. … канд. пед наук: 13.00.01 / О. Г. Проказова. – Астрахань. – 2010. – 24 с.
3. Трубловская, О. М. Практика организации научно-исследовательской деятельности учащихся в общеобразовательной школе / О. М. Трубловская / Поддержка одаренности – развитие активности: материалы междун. конгресса, Витебск, 22 – 27 сент. 2014 г.: в 2 т. / Вит. гос. ун-т; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.), О. Грауманн, М. Н. Певзнер. – Витебск: ВГУ им. П. М. Машерова, 2014. – Т. 1. – С. 218-234.